# ЯЎРЭЙСКАЯ АРХІТЭКТУРА ГРОДНА XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**Савашчэння Д. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт

Навуковы кіраўнік – Сцяпанава А. Ф.

Горад Гродна размясціўся на высокіх нёманскіх ўзгорках. Пра яго можна гаварыць шмат і нават бясконца. Асабліва прываблівае ўвагу незвычайная гродзенская архітэктура, якая адлюстроўвае рысы розных нацыянальнасцей і надае свой асабісты код гораду. Самыя цікавыя і незвычайныя архітэктурныя элементы маюць забудовы яўрэяў, якія складалі большую частку гродзенскага насельніцтва са старажытных часоў аж да Вялікай Айчыннай вайны. Самыя распаўсюджаныя ў іўдаізме матывы знайшлі адлюстраванне на фасадах будынкаў і агароджы балконаў. Яны ўпрыгожваліся вінаградной лазой з уплеценымі фігуркамі звяроў і птушак, выкарыстоўваўся вобраз аленя – сімвала прыгажосці зямлі Ізрайля, хуткасці выканання запаветаў. На фасадзе яўрэйскіх будынкаў і сёння сустракаюцца малюнкі чашы – гэта элемент прыцягвання багацця і дабрабыту, поспеху ў справах. Ні адзін горад ў Беларусі не мае такую колькасць дамоў з чашамі, як Гродна. На сённяшні дзень тут захаваліся чашы на сямі дамах. Напрыклад, дом № 18 на вуліцы 1 Мая, які быў пабудаваны ў 1895 г. Ю.Гіршкохумам [1, с.7]. Зараз налічваецца 18 вялікіх і малых чаш на фасадзе будынка перад вокнамі. На вуліцы Ажэшка 29 над уваходам у апошні пад’езд знаходзіцца чаша – адзінае ўпрыгожванне, якое ўцалела пад акном другога паверха да нашых дзён. На вуліцы Кірава 12а знаходзіцца чаша, якая адрозніваецца ад іншых сваімі памерамі – яна вельмі шырокая. На вуліцы Сацыялістычная 52 захаваліся тры ступенчатыя чашы пад вокнамі першага паверха [2, с.7]. Трэба адзначыць, што чашы на ўсіх дамах розныя і па памерах, і па дэкору. Яны надавалі дамам асобую прыгажосць. Шасцівугольная зорка Давіда таксама выкарыстоўвалася ў якасці ўпрыгожвання будынкаў. Гэта сімвал бясконцасці, зліцця мужчынскага і жаночага пачатку. На вуліцы Паўлоўскага 9б яна прадстаўлена ў выглядзе кветкі. Увогуле, дадзены будынак вельмі багаты на дэкор: тут 8 зорак Давіда і чаша, якая нагадвае банцік [3, с.9].

Таксама часта выкарыстоўваліся сямісвечнікі Менору ў памяць пра калені Ізраілевы і іх выхадзе з Егіпта. Так дэкаравалі дамы па вуліцы Паўлоўскага 9б і па праспекце Касманаўтаў 6. Да нашых дзён дайшоў будынак малітоўнай школы Бенахім (Сацыялістычная 35). Аднапавярховы атынкаваны дом, дэкаратыўная сцяна якога над карнізам імітуе тры вежы, па баках размешчаны дзве Меноры і падвоеныя акенцы выцягнутай формы з паўкруглымі завяршэннямі. Прынята лічыць, што такія формы сімвалізуюць скрыжалі са Старога Завету [4, с.2].

Па вуліцы Студэнцкая 6 знаходзіца вельмі цікавы будынак – “Дом урача”. Выкананы ён у чыстым мадэрне, вылучаецца выразнасцю дэкаратыўнага афармлення, дасягнутай спалучэннем неатынкаваных пласкасцей сцен і

Рэпазіторый ГрДМУ

афарбаваных у белы колер карнізных цяг, аконных ліштваў, выкарыстаннем каваных, у выглядзе перавітых змей рашотак парапета. Таксама выклікаюць цікавасць галовы львоў, якія упрыгожваюць аконныя ліштвы і сімвалізуюць мужнасць, царскую уладу, высакароднасць, адвагу. Дадзеная забудова ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей.

На працягу XX ст. яўрэйскі квартал забудоўваўся паступальна, па адзінай архітэктурнай канцэпцыі. Жылыя забудовы упрыгожваліся яўрэйскай нацыянальнай сакральнай сімволікай. Гэта сведчыць аб захаванасці яўрэйскай абшчыны, яе самасвядомасці і сувязі з нацыянальнымі традыцыямі дадзенага рэгіёна.

ЛІТАРАТУРА:

1. Краязнаўчыя запіскі. Выпуск 10 / – Гродна: ЮрСаПрынт. 2016. – С. 82.
2. Саяпин, В. Ю. 50 гродненских улиц. Прогулка во времени / В. Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2015. – 326 с.
3. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы / А. Вашкевіч [і інш.]; пад.рэд. А. Данілевіч. – Гарадзенская бібліятэка, 2012. – 370 с.
4. Шлык, Н. Неповторимый шарм старого города / Н. Шлык // Гродзенская праўда. – 2015. – 23 мая. – С. 5.

## «МЕМ» И ЕГО ИСПОЛЬЗОВАНИЕ В СОВРЕМЕННОМ ЯЗЫКЕ

**Сафонова П. Р.**

Гродненский государственный медицинский университет
Научный руководитель – Севенко Ю. С.

Мемы – культурный феномен, который появился в среде цифрового общения: в соцсетях, чатах и на форумах. Язык всегда стремился к емкой и образной передаче смыслов и ценностей – любой народ может предъявить богатое наследие пословиц и поговорок [1]. Развитие культуры включает в себя не только расширение возможностей человека, создание новых, их дифференцировку и усложнение, но и упрощение, примитивизацию и даже деградацию уже существующих систем, редукцию некоторых ее элементов. Всеобщая мировая культура отражает любые перемены и видоизменения в обществе, тем самым порождая и внедряя в нашу обычную практику новые явления. Чаще всего мы переносим реальное сообщение в интернет, но существует феномен, который проникает из интернет-пространства в нашу повседневную жизнь, – это интернет-мем.

Само по себе слово «мем» обозначает единицу любого вида информации, будь то звук, картинка или видео, передающееся от человека к человеку посредством интернета, а в частности социальных сетей и мессенджеров. Впервые в подобном значении термин был употреблен английским биологом Ричардом Докинзом в 1976 году [2]. Его теория заключалась в том, что базовой

Репозиторий ГрГМУ